**ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ)**

# Асвятленне перадвыбарчай сітуацыі ў беларускіх медыях

## Бюлетэнь №1

*(1 сакавіка – 1 ліпеня 2008 г.)*

Маніторынг «Асвятленне парламенцкіх выбараў 2008 года ў беларускіх медыях» мае на мэце высветліць, наколькі поўна і ўсебакова беларускія медыя асвятляюць выбрачы працэс ды дзейнасць тых суб'ектаў (як асобаў, так і структур), якія ўдзельнічаюць у ім, наколькі публікаваныя матэрыялы адпавядаюць прынцыпам журналісцкай этыкі і прафесійным стандартам журналісцкай працы падчас выбараў. Гэты бюлетэнь прысвечаны перадвыбарнай сітуацыі і мае на мэце выявіць агульны тон яе асвятлення ў беларускіх СМІ.

Аб'ектам маніторынгу былі праграмы *"Наши новости» (ОНТ), "Панорама недели"* (*Першы Нацыянальны канал БТ*), *"Радыёфакт" (Першы нацыянальны канал беларускага радыё),* газеты *"Беларусь сегодня","Рэспубліка", "Белорусы и рынок";* інтэрнет-выданні "*www.naviny.by, www.tut.by* і інтэрнет-версія "Еўрапейскага радыё для Беларусі" *www.euroradio.fm.* Аналіз ахоплівае перыяд чатырох месяцаў – *ад1 сакавіка да 1 ліпеня 2008 г.*- і выкарыстоўвае як якасныя, так і колькасныя паказчыкі асвятлення перадвыбарчай сітуацыі.

Сітуацыя, у сваю чаргу, падаецца праз чатыры галоўныя тэмы: "Парламенцкія выбары", "Стасункі "Беларусь-Расія", "Стасункі "Беларусь-Еўрасаюз", "Інфляцыя і самапачуванне грамадства/сацыяльных груповак", рэпрэзентаваныя ў вышэйназваных медыях.

### 1. Асноўныя вынікі маніторынгу і некаторыя высновы

Беларускія дзяржаўныя медыя надалі асвятленню будучых выбараў значна большую ўвагу, чым парламенцкім выбарам 2004 г.;

Хаця дзяржаўныя медыя не прамінулі рэпрэзентаваць беларускую апазіцыю ў надзвычай негатыўным святле, затое агучылі намеры кіраўніцтва краіны правесці выбары больш адкрыта і з шырэйшым удзелам апазіцыйных партый. Тыя ж намеры выказаны і адносна ўдзелу ў выбарах заходніх назіральнікаў. Разам з тым, некаторыя беларускія праваабарончыя арганізацыі, публічна заявіўшы пра свой удзел у назіранні, сутыкнуліся са спробамі ціску на іх з боку ўладаў;

Між тым, беларуская апазіцыя (беларускія апазіцыйныя палітычныя партыі) не атрымала ў медыях хоць якога заўважнага асвятлення сваёй перадвыбарчай дзейнасці (выключэнне складаюць негатыўныя прапагандысцкія сюжэты Беларускага тэлебачання);

Вялікую цікавасць да выбараў выявіў Еўрасаюз. У заявах афіцыйных асоб падкрэсліваецца, што дэмакратычна праведзеныя выбары ў Беларусі могуць стаць

сур’ёзнай падставай для нармалізацыі і развіцця адносін ЕС і Беларусі. Зацікаўлення ж Расіі гэтымі выбарамі беларускія медыі не зафіксавалі;

Выглядае, што беларускія ўлады будуць імкнуцца выкарыстаць выбары дзеля паляпшэння свайго міжнароднага іміджу і ўмацавання легітымнасці рэжыму на еўрапейскай палітычнай сцэне;

Афіцыйныя беларускія медыі, гэтак жа сама, як і кіраўніцтва краіны, захоўвалі ранейшую рыторыку адносна пабудовы “саюзнай дзяржавы”. Аднак рэальным зместам стасункаў Беларусі і Расіі з’яўляліся кошты на энерганосьбіты, утрыманне якіх на нізкім узроўні ёсць найважнейшай задачай беларускага боку;

Цалкам верагодна, што Расія і надалей будзе падтрымліваць спрыяльны рэжым коштаў на энерганосьбіты, аднак пры пэўных саступках беларускага боку. Сімптаматычна, што ў кантэксце публічнага абмеркавання коштаў на энерганосьбіты расійскі пасол А.Сурыкаў заявіў пра магчымае размяшчэнне ў Беларусі расійскіх супрацьракетных сістэм;

Правядзенне сёлетніх выбараў супала з “новай фазай” стасункаў “Беларусь-Еўрасаюз”. Сутнасць яе палягае як у пашырэнні прагматычных (эканамічных) узаемасувязяў, у якіх перадусім зацікаўлена Беларусь (прыцягненне заходніх інвестыцый), так і ў развіцці дэмакратычных інстытуцый унутры Беларусі і “палітыкі добрасуседства”, у чым перадусім зацікаўлены ЕС;

Пра знешнепалітычныя прыярытэты Беларусі ў гэты перыяд маніторынгу сведчаць як колькасныя, так і якасныя паказчыкі. Асабліва выразна гэта прадэманстравала прэзідэнцкая газета *“Беларусь сегодня”* на пачатку маніторынгу (сакавік-красавік). Тэме “Стасункі “Беларусь-Еўрасаюз” (СБЕ) у было прысвечана 16 матэрыялаў, а “Стасункі “Беларусь-Расія” (СБР) – 12. Яшчэ больш яскрава гэтую тэндэнцыю падкрэслівае агульная плошча матэрыялаў: “СБЕ” было адведзена 4 104см$^2$, а “СБР” – амаль удвая меней. Да таго ж зважым на раней немагчымае для “СБ” - усе матэрыялы, прысвечаныя ўласна Еўропе і стасункам Беларусі з ёй, спрэс пазітыўныя.

Сацыяльная сітуацыя ў краіне асвятлялася дзяржаўнымі і недзяржаўнымі медыямі галоўным чынам зыходна ад стану інфляцыі (росту цэн на тавары і паслугі). Пры гэтым адзначалася, што сітуацыя ў краіне стабільная. Аднак, як паказаў маніторынг, “рэакцыя” беларускай эканомікі на мінулагодняе падвышэнне коштаў на энерганосьбіты аказалася нечаканай для ўраду.

Разам з тым, у гэты ж перыяд былі часткова альбо амаль цалкам вернуты раней адмененыя ільготы пенсіянерам. Павялічана адрасная дапамога. Таму можна дапусціць, што самапачуванне некаторых катэгорый і маламаёмасных грамадзян і сямей хоць і нязначна, але пагоршылася. Варта таксама адзначыць, што газета *«Беларусь сегодня»*, адрозна ад *“Рэспублікі”* (і тым больш ад недзяржаўных медыяў), заўважна ўхілялася ад асвятлення вострай сацыяльнай праблематыкі.

Напрыканцы агляданага перыяду дзяржаўныя медыі заакцэнтавалі ўвагу на падвышэнні зарплат медыкам, сацыяльных пенсій і стыпендый студэнтам, а таксама на перспектывах росту заработнай платы ў 2009 –2011 гг., якая мае за гэты час падвоіцца.

Недзяржаўныя медыі, асвятляючы сацыяльную праблематыку і закранаючы такія тэмы, як інфляцыя, рост коштаў на энерганосьбіты і падвышэнне заработнай платы, імкнуліся падмацаваць таксама ўласныя развагі меркаваннямі экспертаў.

Надалей вынікі маніторынгу канкрэтызуюцца, і падаюцца іншыя матэрыялы датычна асвятлення перадвыбарчай сітуацыі, на падставе якіх робяцца канчатковыя высновы.

### 1.2 Будучыя парламенцкія выбары

24 чэрвеня А.Лукашэнка падпісаў загад аб прызначэнні на 28 верасня 2008 г. выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Гэта стала афіцыйным пачаткам выбарчай кампаніі.

І хаця цягам першых трох месяцаў маніторынгу будучыя выбары не з'яўляліся важнай тэмай для беларускіх медыяў, яны ў іх зрэдку прысутнічалі (ускосна альбо наўпрост). Так, сакратар ЦВК М.Лазавік, які ў якасці назіральніка быў на прэзідэнцкіх выбарах у Расіі, заклікаў беларускую апазіцыю *"научиться не только выигрывать, но и проигрывать»*. Паводле яго слоў, у Расіі, адрозна ад Беларусі, «*политики признали победу лидера и не намерены дестабилизировать социально-экономическую ситуацию в стране»* (*http://naviny.by/rubrics/economic/2008/03/03/ic_news_113_286801/*). А кіраўнік офісу АБСЕ ў Мінску вітаў памкненне Беларусі запрасіць на выбары міжнародных назіральнікаў. Ён адзначыў, што беларускія ўлады прынялі *"очень важное политическое решение о приглашении международных наблюдателей на выборы без ограничений" (http://naviny.by/rubrics/politic/2008/03/18/ic_news_112_287682/).*

Прыкметна, што апошні месяц гэтага перыяду выявіў як заўважны рост колькасці матэрыялаў, прысвечаных выбарам, так і значна шырэйшую цікавасць да іх з боку медыяў. Параўнальна з парламенцкімі выбарамі 2004 г., калі *"дзяржаўныя электронныя і друкаваныя медыі, асабліва на пачатку выбарчай кампаніі, не надавалі тэме выбараў істотнай увагі"*[1], увага медыяў да сёлетніх выбараў відочна павялічылася. А характар выказванняў розных службовых асоб і кіраўніка краіны сведчыць, што ўлада спрабуе надаць ім як мага большую палітычную вагу. Так, прыкладна за месяц да абвяшчэння дня выбараў сакратар ЦВК М.Лазавік заявіў, што Цэнтрвыбаркам збіраецца прапанаваць Прэзідэнту падпісаць указ, які даваў бы прадстаўнікам палітычных партый магчымасць удзельнічаць у працы ЦВК з правам дарадчага голасу. Пры гэтым ён заклікаў

[1] Медыя-маніторынг у Беларусі: "Парламенцкія выбары 2004 года у сродках масавай інфармацыі Беларусі", "Невский простор", сакавік 2005. С. 21

апазіцыю актыўна ўдзельнічаць у выбарах, параіўшы ёй аб’яднацца: *«если оппозиция пойдет на выборы единым фронтом, этот вариант был бы для нее более выигрышным». (http://naviny.by/rubrics/politic/2008/05/26/ic_articles_112_157251/)*. Старшыня ЦВК Л.Ярмошына, у сваю чаргу, заявіла, што ЦВК будзе працаваць, каб усясветная супольнасць прызнала вынікі выбараў *(http://naviny.by/rubrics/politic/2008/06/27/ic_articles_112_157798/)*.

Нарэшце, пасля абвяшчэння даты выбараў, А.Лукашэнка сказаў: *«Мы хотим провести выборы открыто и демократично, чтобы нас потом не упрекали» (http://naviny.by/rubrics/politic/2008/06/24/ic_news_112_292618/)*. А праз тыдзень ён зазначыў: *"Принципиально новым аспектом проведения выборов станет расширение прав политических партий и оппозиции" (http://naviny.by/rubrics/politic/2008/07/02/ic_news_112_293102/)*.

Вялікую цікавасць да выбараў выявілі і прадстаўнікі ЕС. Напрыклад, дырэктар дэпартаменту ўсходняй палітыкі польскага МЗС Марыюш Машкевіч лічыць, што *"сигналом к началу оттепели в отношениях Брюссель-Минск могут стать намеченные на сентябрь нынешнего года внеочередные парламентские выборы в Беларуси” (http://news.tut.by/politics/111819.html)*. Амбасадар Нідэрландаў Марнікс Кроп выказаўся яшчэ больш адназначна: *"Сейчас мы готовимся к парламентским выборам в Беларуси, которые состоятся 28 сентября. ЕС еще раз подтвердил свои условия: проведите свободные демократические выборы — и мы начнем сотрудничество" (http://news.tut.by/politics/111878.html)*.

Пры тым, напярэдадні афіцыйнай выбарчай кампаніі Беларускае тэлебачанне не прамінула зважыць на беларускую апазіцыю, традыцыйна рэпрэзентаваўшы яе як дэструктыўную і экстрэмісцкую сілу, што карыстаецца фінансамі амерыканскіх фондаў (*БТ, Першы нацыянальны канал, «Панорама недели», 01.06.08 і 08.06.08*). А газета *“Наша ніва” (26.06. 08 )* паведаміла: *“на наступны дзень пасьля прэс-канфэрэнцыі, дзе прадстаўнікі праваабарончых арганізацый заявілі пра супольны маніторынг парлямэнцкіх выбараў, да іх прыйшлі падаткавікі”.* Апрача таго, паводле той самай газеты, дэкларацыі аб прыбытках і маёмасці мусяць падаць не толькі кіраўнікі гэтых арганізацый, але і іх сваякі.

### 1.3 Стасункі “Беларусь-Расія”

Хаця ў афіцыйных медыях стасункі краін працягвалі характарызаваць як працэс “пабудовы саюзнай дзяржавы”, беларускі бок адназначна імкнуўся да ўсталявання сістэмы аднабаковых прэферэнцый, датацый і нізкіх коштаў на энерганосьбіты, што і інтэрпрэтавалася ім як “саюзніцкія” адносіны.

Падзеямі, якія ўплывалі на асвятленне тэмы ў пачатку гэтага перыяду, былі перамовы адносна коштаў на газ, прэзідэнцкія выбары ў Расіі і візіт новага расійскага прэзідэнта ў Беларусь. Віншуючы Дз.Мядзведзева з абраннем на

пасаду Прэзідэнта Расіі (*“Президент поздравил Дмитрия Медведева с победой на выборах”, «СБ», 4.03.08),* А.Лукашэнка, аднак, ні словам не згадаў Саюзнай дзяржавы. Тым часам, у Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі, ніхто з вышэйшага кіраўніцтва Расіі не павіншаваў са святам ні беларускага Прэзідэнта, ні беларускі народ. І хаця з нагоды гэтай даты з’явіўся цэлы шэраг матэрыялаў (*«СБ» 2.04.08: “Общий праздник”, “Поздравление”, “Сябры”; “Рэспубліка”, 2.04.08: «Символ единства народов», «Вместе уверенней шагать», «Поздравительное послание»)*, усе яны не вылучаюцца якім-кольвек канкрэтным зместам. Гэта азначае, што ідэя Саюзнай дзяржавы ёсць усяго толькі палітычным рытуалам, ад якога пакуль ні адзін, ні другі бок не маюць жадання пазбаўляцца**.** Пацвердзіў гэта і візіт Дз.Мядзведзева ў Беларусь. Заўважым: сустрэча прэзідэнтаў адбылася 22 чэрвеня ў Брэсце, адкуль пачалася вайна Германіі з СССР. Гэта азначае, што акцэнт рабілі не на рэальны, а на сімвалічны план. Відавочна, ні адзін з бакоў яшчэ не гатовы (і не хоча) нешта меняць ва ўзаемаадносінах краін. Таму А. Лукашэнка пасля сустрэчы толькі цытаваў словы Дз.Мядзведзева: «Союзное государство есть, его просто надо наполнить реальным содержанием» *(“Встреча президентов”, “СБ”, 24.06. 08).* «Коль мы не приняли Конституционный акт Союзного государства, то будем жить по договору, -- процитировал коллегу Александр Лукашенко. - Дмитрий Медведев предложил не ставить глобальных интеграционных целей, а выбрать пару десятков злободневных вопросов; когда они будут решены, люди увидят пользу в Союзном государстве» *(«Рабочий день Президента», «СБ», 25.06.08).*

Затое кошты на газ ды іншыя энерганосьбіты заставаліся вельмі важным элементам у стасунках дзвюх краін. Беларускі бок, як і раней, разлічвае на спрыяльныя ўмовы. Так, адзін з функцыянераў Саюзнай дзяржавы В.Хрол лічыць, што газ для Беларусі мусіць каштаваць не даражэй за 80 долараў, а “*союзнические отношения должны быть превыше краткосрочных финансовых потребностей того или иного субъекта хозяйствования" (http://naviny.by/rubrics/economic/2008/03/28/ic_news_113_288346/).*

Паўза чакання (прыкладна да 20 сакавіка) новых коштаў на газ (128 дол. за 1000 м. куб.) характаразывалася пэўнай напружанасцю і няпэўнасцю. “Далейшае паглыбленне вайсковага супрацоўніцтва з Расіяй ды падпісанне пагаднення з буйнейшай у СНД расійскай карпарацыяй “Сістэма”, якая шчыльна ўзаемадзейнічае з расійскімі дзяржаўнымі структурамі і займаецца інвеставаннем у шэраг галін эканомікі, можна ў пэўнай ступені ўспрымаць як спробу паўплываць на станоўчае для беларускага боку рашэнне газавага пытання” *(http://naviny.by/rubrics/economic/2008/03/13/ic_articles_113_156043/).*

Расійскі бок, у сваю чаргу, настойліва імкнуўся пашырыць эканамічную прысутнасць у Беларусі. І, як выглядае, экспансія расійскага капіталу, хоць і не без некаторых перашкод, але ўсё ж паспяхова доўжыцца. Паказальнымі з’яўляюцца наступныя звесткі: *“Расійская кампанія "Лукойл" выдаткуе 400 мільёнаў долараў на адкрыццё сеткі аўтазаправачных станцый алімпійскага фармату, у тым ліку ў Беларусі*” (*http://www.euroradio.fm/by/523/news/?tpl=135#), “У склад назіральнага савета "Белтрансгазу" ўключаны яшчэ адзін прадстаўнік*

*"Газпрома""* (*http://www.euroradio.fm/by/523/news/?tpl=135#*), а таксама несуцяшальныя высновы расійскага боку пра 20 сур'ёзных перашкод прасоўвання расійскай прадукцыі на беларускі рынак (*"Старые проблемы нового правительства", "Белорусы и рынок", 24.03.08*). Шкадуюць – значыць пралічваюць стратэгічныя крокі.

Пасля падпісання "газавага" пагаднення акцэнт быў зноў перанесены на захаванне беларускай незалежнасці. "*Тот путь, который нам предложен Россией, — для нас неприемлем. Мы не можем стать частью любого другого государства, не только России" (Лукашенко не отдаст лакомый кусок в центре Европы: http://naviny.by/rubrics/politic/2008/04/26/ic_articles_112_156828/*). І ўжо 30 красавіка кіраўнік дзяржавы заявіў, што гатовы наладжваць нармальныя стасункі з Захадам *("Лукашенко: Беларусь суверенитетом не торгует" http://naviny.by/rubrics/politic/2008/04/30/ic_media_112_1880/)*. А калі адкінуць рытуальныя матэрыялы, прысвечаныя выбарам прэзідэнта Расіі і Дню яднання, друкаваныя дзяржаўнымі агульнанацыянальнымі газетамі "*Белорусь сегодня"* і *"Рэспублікай",* то Расія, як актуальны для геапалітыкі Беларусі суб'ект, у сакавіку-красавіку амаль не згадваецца на старонках афіцыйных медыяў.

Наступныя два месяцы стасункі "Беларусь-Расія" асвятляліся беларускімі медыямі паводле той жа схемы: абодва бакі падчас сустрэчы ў Брэсце задэкларавалі вернасць ідэі саюзнай дзяржавы (Прэзідэнт Расіі ў сваім выступе, праўда, зрабіў акцэнт на двухбаковых стратэгічных адносінах краін) (*БТ, Першы нацыянальны канал, «Панорама недели», 22..06.08*). Далей, ад пачатку чэрвеня, зноў пачынае актуалізавацца тэма коштаў на расійскі газ *("На союзном Совмине 27 июня будут рассмотрены цены на российский газ для Беларуси" http://naviny.by/rubrics/economic/2008/06/03/ic_news_113_291556/)*. Напярэдадні запланаванага пасяджэння міністр эканомікі М.Зайчанка выказаў перасцярогу*: "Если цена на газ будет высокой, более чем 140 долларов, то это отразится на макроэкономических показателях".* І адзначыў, што прагназаваны на 2009 г. рост ВНП на 10--12% разлічваўся зыходзячы з кошту на газ 140 долараў. *(http://naviny.by/rubrics/economic/2008/06/26/ic_news_113_292747/)*. Расійскі бок гэтым часам выставіў прэтэнзіі да Беларусі датычна аплаты за газ (*"Зубков: Беларусь и Украина должны выполнять свои обязательства перед «Газпромом»: (http://naviny.by/rubrics/economic/2008/06/27/ic_news_113_292844/*), а сакратар Саюзнай дзяржавы "прыспешыў" інтэграцыю, агучыўшы меркаванне, што ўжо да канца году Беларусь і Расія могуць увесці адзіную валюту *(http://naviny.by/rubrics/politic/2008/06/27/ic_news_112_292800/)*. Нарэшце ў інтэрв'ю газеце *"Комсомольская правда в Белоруссии»* А.Лукашэнка заявіў, што расійскі бок парушае прынцып роўнасці ў гэтым пытанні *(http://news.tut.by/daynews/)*. Такім чынам, дынамічная раўнавага ў стасунках Беларусі і Расіі была адноўлена. А палітычныя і эканамічныя аргументы ў расійска-беларускіх адносінах, як выглядае, робяцца усё больш несумяшчальнымі.

Разам з тым, варта заўважыць, што закладзеныя беларускім бокам на 2009 г. кошты на расійскі газ могуць быць атрыманы шляхам чарговых саступак. Так, у

кантэксце публічнага абмеркавання коштаў на энерганосьбіты расійскі пасол А.Сурыкаў заявіў пра магчымае размяшчэнне ў Беларусі расійскіх супрацьракетных сістэм (*http://news.tut.by/politics/110641.html*).

### 1.4 Стасункі “Беларусь-Еўрасаюз”

Пра сапраўдныя знешнепалітычныя прыярытэты Беларусі ў гэты перыяд сведчаць як колькасныя, так і якасныя паказчыкі аналізу. Асабліва выразна гэта прадэманстравала *прэзідэнцкая* газета “*Беларусь сегодня*” ў пачатковы перыяд маніторынгу (сакавік--красавік). Тэме *“Стасункі “Беларусь-Еўрасаюз” (СБЕ*) у ёй было прысвечана 16 матэрыялаў, а *“Стасункі “Беларусь--Расія” (СБР)* – 12. Яшчэ больш яскрава гэтую тэндэнцыю падкрэслівае агульная плошча матэрыялаў: “*СБЕ*” было адведзена 4 104 кв. сантыметра, а “*СБР*” – 2 482 (амаль удвая меней). Да таго ж зважым на раней немагчымае для “*СБ*”: усе матэрыялы, прысвечаныя ўласна Еўропе і стасункам Беларусі з ёй, спрэс пазітыўныя.

Вельмі паказальнай у гэтым сэнсе з’яўляецца серыя “палосных” матэрыялаў карэспандэнта “*СБ*” І. Кольчанкі, прысвечаных Радзе Еўропы ўвогуле і апошняму пасяджэнню ПАРЕ ў прыватнасці, якія чатыры нумары запар друкавала газета (*«Европа – совет или ультиматум», «Европа не заканчивается на Буге», «Наш общий дом Европа», «Фотосессия ПАСЕ» -- «СБ» 15, 16, 17, 18. 04.08*). Магчыма, адну з прычын такой увагі да Рады Еўропы тлумачыць матэрыял «*СЕ как виза для ЕС*» (*Рэспубліка», 2.04.08*), у якім гаворка вядзецца пра тое, што права прысутнічаць на еўрапейскім рынку трэба яшчэ заслужыць, і перадусім - праз давер Рады Еўропы.

Адкрыццё прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі *(“Политика соседства”,“СБ”, 1.03.08 ),* сустрэча А.Лукашэнкі з групай англійскіх бізнесоўцаў (*“Гарантийный талон”,“СБ”, 1.03.08)* і асабліва з сябрам Палаты лордаў Вялікабрытаніі Цімаці Бэлам, на якой абмяркоўваліся праблемы паляпшэння міжнароднага іміджу Беларусі *(“Работа над образом”, “СБ”, 14.03.08)* – усе гэтыя падзеі (як і шэраг іншых) сведчаць, што беларускія ўлады “шырокім фронтам” пачалі наступ на Еўропу з мэтай захопу там найперш эканамічных плацдармаў (а потым ужо і палітычных). Досыць паказальным фактам у гэтым плане бачыцца выказванне МЗС Беларусі з прычыны санкцый ЗША адносна нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў краіны, а менавіта: “*ЗША парушаюць узгоднены алгарытм дзеянняў па нармалізацыі стасункаў Беларусі з ЕС і другімі дзяржавамі” («Игра без правил», “Рэспубліка”, 11.03.08).* Гэта значыць, санкцыі ЗША турбуюць улады Беларусі не самі па сабе, а таму, што яны замінаюць наладжванню стасункаў з Еўрасаюзам.

Але прыкметна, што ў гэтай фазе стасункаў беларускі бок і ЕС па-рознаму вызначылі свае прыярытэты. Калі для еўрапейскага боку яны звязаны з развіццём дэмакратычных каштоўнасцяў, з шырокім спектрам палітычных і гуманітарных праблем, дык для беларускага – выключна з прагматычнымі і эканамічнымі мэтамі. “Канфлікт” непаразумення быў у хуткім часе сфармуляваны кіраўніком

беларускай дзяржавы: “*Демократия в Беларуси такая же, как и в Австрии, почти один к одному. Демократические ценности в Беларуси не менее высокого уровня, чем в любой другой европейской стране... Так чего же еще не хватает в демократическом портрете Беларуси? Что еще надо Европе от Беларуси?” (http://naviny.by/rubrics/politic/2008/03/20/ic_news_112_287817/).* У дадатак, Еўрасаюз быў звінавачаны за несамастойнасць і залежнасць ад ЗША. А таму, паводле А.Лукашэнкі, ціск Захаду на Беларусь прывядзе Беларусь да яшчэ больш шчыльных стасункаў з Расіяй.

Гэткім чынам, стасункі Беларусі з Расіяй і ЕС можна вызначыць як спробу балансавання між Захадам і Ўсходам з выразна прагматычнымі мэтамі захавання статусу кво сённяшняга палітычнага рэжыму, кантролю над сітуацыяй у грамадстве і рэформамі ў эканоміцы. Выдае таксама на тое, што стасункі з ЕС беларускі бок намерваецца зрабіць рэальным фактарам сваёй замежнай палітыкі.

Між тым, цягам двух апошніх месяцаў тэма стасункаў з Еўрасаюзам атрымала крыху адрозную ад ранейшай “аранжыроўку”. З абодвух бакоў не было гучных заяў і катэгарычных прамоў. Еўрасаюз адпрацоўваў сцэнары пакрокавай разбудовы пэўных структур уплыву на беларускія ўлады – праз дамовы аб прысутнасці сваіх назіральнікаў на вераснёўскіх выбарах, магчымыя эканамічныя кантракты ды інвестыцыі. Працягвалі гучаць толькі заявы пра гатовасць беларускага кіраўніцтва да дыялогу, а зазвычай палемічны стыль адносін з Захадам выразна “памякчэў”: *«Руководители этих структур понимают, что Беларусь не может находиться в изоляции. Но мы им все время говорим: пока вы не будете делать шаги навстречу и после выполнения одних требований ставить следующие – так дело не пойдет!»* (кіраўнік Палаты прадстаўнікоў В.Папоў у інтэрв’ю *«Радыёфакту», 30.05.08*) альбо *«Была подчеркнута заинтересованность Парламентского собрания в деловых, взаимоуважительных отношениях. Никаких новых выпадов или инициатив предъявлено не было»* (парламентар Анатоль Красуцкі пра перамовы з ПАСЕ ў інтэрв’ю *«Радыёфакту», 26.05.08*). Прыгадаем яшчэ і словы А.Лукашэнкі падчас сустрэчы з новымі замежнымі амбасадарамі на самым высокім узроўні: *«Европейские державы не совсем понимают наш весомый вклад в мировую стабильность»* (*«Радыёфакт», 28.05.08*). “Новую” фазу стасункаў азначыў і візіт дзяржаўнага сакратара Папы Рымскага Тарчызіо Бертоне. Цікава, што ён адбыўся практычна адначасна з візітам Дз. Мядзведзева.

Візіт Т. Бертоне актыўна і вельмі прыязна асвятляўся ў друку. Газета *«Беларусь сегодня»* нават падала на першай паласе вялікі фотаздымак з сустрэчы А.Лукашэнкі з Т.Бертоне, на якой Прэзідэнт сказаў, што *«Беларусь готова участвовать в укреплении безопасности на континенте» («Общие ценности», «СБ», 21.06.08*). На адказ Т.Бертоне зазначыў: *«Католическая церковь признает предназначение Беларуси как моста между Востоком и Западом и готова помогать налаживать эти отношения» (там жа)*. Але бадай найбольш цытаванымі ў дзяржаўнай прэсе былі наступныя словы Т. Бертоне: *«Ватикан выступает за признание права каждого народа на выбор собственного пути развития и против любых эмбарго и экономических санкций, от которых в*

*первую очередь страдает население» («Папа Римский любит Беларусь», «Рэспубліка», 24.06.08).*

Аднак у дзяржаўных медыях звыкла гучала і негатыўная інфармацыя пра краіны Еўрасаюзу. *«Радыёфакт»* агучыў канфлікты ў польскім урадзе *(03.06.08),* «сялянскі бунт» у Латвіі *(12.06.08)*, праблемы рыжскіх пенсіянераў (*19.06.08*), інфляцыю ў зоне еўра *(05.06.08)*. Зрэшты, гэта не мела, як тое было раней, сістэмнага характару.

## 1.5 Інфляцыя і самапачуванне грамадства

Паводле матэрыялаў газет *"Беларусь сегодня"* і *"Рэспубліка",* у краіне стабільная сацыяльна-палітычная і эканамічная сітуацыя. Са слоў С. Сідорскага *"Рост внутреннего валового продукта Беларуси за январь--февраль текущего года составил 9,9%»* (*«В экономике устойчивый рост», («Рэспубліка», 14.03).* А *«вклады населения в банках с начала года увеличились на 626,7 миллиардов рублей и превысили 11 триллионов» («Доверие», «СБ», 14.03.08).*

Ускосным сведчаннем сацыяльнага прагрэсу сталі і шырока цытаваныя газетамі выказванні генеральнага сакратара Міжнароднага саюзу электрасувязі: *"В Беларуси самый высокий в СНГ уровень покрытия территории мобильной связью (89%)». ( «Вклад в ликвидацию цифровых разрывов», «Рэспубліка», 16.04.08).* «*По последней информации абонентами операторов сотовой связи в Беларуси является более 7 миллионов человек. Почти 3 миллиона человек или 30% населения в числе пользователей интернета» («Настройка соединения», «СБ», 22.04. 08).*

Пры тым, што матэрыялы аналізаванага перыяду засведчылі і некаторыя праблемы. Самая сур'ёзная – інфляцыя, якую беларускі ўрад удала апраўдвае, але якое не здольны спыніць. У дакладзе Прэзідэнту С.Сідорскі паведаміў: *"Инфляция за январь--март сложилась на уровне 4,1%. В России инфляция за этот период составила 4,8%, в Украине – более 9%". ("Доклад", "СБ", 11.04.08*"). А напрыканцы красавіка А.Кабякоў удакладніў: *"Инфляция за первый квартал составила 4,1%, или 1,3% в месяц, при прогнозе 0,5--0,6% в месяц"* (*http://naviny.by/rubrics/economic/2008/04/25/ic_news_113_289777/*). Гэткім чынам, відочна, што "рэакцыя" беларускай эканомікі на мінулагодняе падвышэнне коштаў на энерганосьбіты аказалася нечаканай для ўраду.

Акрамя інфляцыі, адной з асноўных праблем С.Сідорскі лічыць таксама значны недахоп інвестыцый. (*«Инвестиционный штиль противопоказан», "Рэспубліка", 17.04.08).* Відавочна, менавіта апошняе пасунула А. Лукашэнку да скасавання «залатой акцыі», што адкрывае шырокія магчымасці прыцягнення ў краіну замежнага капіталу (*«На вес золота», «СБ», 06. 03.08).*

Газета *“Рэспубліка”* ў матэрыяле з назвай *“Уж на работу невтерпеж” (14.03.08)* сфармулявала яшчэ адну праблему, якая ахоплівае як сацыяльную, так і эканамічную сферы краіны: колькасць вольных працоўных месцаў перавысіла сёння колькасць беспрацоўных. Пры гэтым траціна працоўнага насельніцтва не зафіксавана як працаўладкаваная.

Такім чынам, сацыяльная сітуацыя хоць і характарызавалася паўставаннем некаторай напругі ў паўзе чакання новых коштаў на газ і ў часе пазапрагнознага росту інфляцыі, заставалася, аднак, стабільнай.

Аналізаваны перыяд адметны таксама частковым пераглядам раней адмененых льгот. Таму можна дапусціць, што самапачуванне некаторых катэгорый маламаёмасных грамадзян і сямей пагоршылася. Варта тут таксама адзначыць, што газета *«Беларусь сегодня»*, адрозна ад *“Рэспублікі*” і тым больш недзяржаўных медыяў, рашуча ўхілялася ад тэм (і аналізу) сацыяльнай праблематыкі, калі іх нельга перавесці ў публіцыстычныя дэкларацыі рэдакцыйнай палітыкі. За май-чэрвень было надрукавана ўсяго тры невялікіх матэрыялы, якія, да таго ж, маюць толькі ўскоснае дачыненне да гэтай праблематыкі. Затое *“Беларусь сегодня”*, як і ншыя дзяржаўныя медыі, акцэнтавала ўвагу на перспектывах росту заработнай платы ў краіне. З аналізу ж матэрыялаў газеты *«Рэспубліка»* добра бачна, што цяпер для ўраду найбольш актуальныя дзве праблемы - інвестыцыі і прыватызацыя, што, папраўдзе, зліваюцца ў адну, ад вырашэння якой залежаць і стан пачування грамадства, і перспектывы развіцця краіны, і, найперш, трываласць самога рэжыму.

Вяртанне сілавым структурам (галоўнае апірышча рэжыму) раней адмененых ільгот і частковая кампенсацыя ільгот праезду ў прыгарадным транспарце пенсіянерам (адзін з важных сегментаў электарату Лукашэнкі) паказваюць на тое, што самакансалідацыя рэжыму па-ранейшаму ёсць адной з яго палітычных мэт.

Напярэдадні выбарчай кампаніі было таксама абвешчана пра падвышэнне зарплат медыкам, сацыяльных пенсій (*ОНТ, “Наши новости”, 13.06.08)* і стыпендый студэнтам *(“Увеличены размеры всех видов стипендий” – ОНТ, “Наши новости”, 18.06.08*).

Але пры тым варта зважыць на нечаканы для ўраду рост інфляцыі. Ён паказвае нарастанне ўнутрысістэмных супярэчнасцяў беларускай эканамічнай мадэлі, якую вывесці з раўнавагі можа нават нязначнае падвышэнне коштаў на энерганосьбіты і сыравіну.

## 2. Высновы

Шырэйшае асвятленне перадвыбарчага працэсу ды заявы беларускіх афіцыйных асоб ілюструюць, што цяперашнім выбарам надаецца заўважна большая палітычная вага, чым раней.

Стасункі Беларусі з Расіяй хоць і захаваюць “саюзніцкую” рыторыку, аднак будуць развівацца ў прагматычным рэчышчы: беларускі бок захавае зацікаўленне нізкімі коштамі на энерганосьбіты і на рынках збыту, а расійскі – стратэгічным кантролем, дамагаючыся яго праз абаронныя і эканамічныя саступкі.

У стасунках з Беларуссю Еўрасаюз паступова дыстанцыюецца ад дэклараванага раней пакету 12 умоў і пераходзіць да пакрокавай стратэгіі выбудовы адносін з афіцыйным Мінскам, выкарыстоўваючы дзеля гэтага ў тым ліку і больш прагматычны падыход (пашырэнне эканамічнага супрацоўніцтва). Выдае таксама на тое, што беларускі бок спрабуе зрабіць стасункі з Еўрасаюзам рэальным фактарам сваёй замежнай палітыкі.

Сацыяльная і эканамічная сітуацыя характарызавалася беларускімі медыямі як адносна стабільная, аднак дзржаўныя медыі (адрозна ад таго, як было напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў) ужо не акцэнтавалі на гэтым увагі.

Вяртанне сілавым структурам (галоўнае апірышча рэжыму) раней адмененых ільгот і частковая кампенсацыя ільгот праезду ў прыгарадным транспарце пеэнсіянерам (адзін з важных сегментаў электарату Лукашэнкі) паказваюць, што самакансалідацыя рэжыму па-ранейшаму ёсць адной з яго палітычных мэт.

Можна таксама дапусціць, што ў стасунках улады і некаторых сацыяльных груповак (у раней дзейных сацыяльных кантрактах) пачаліся змены ў кірунку нарастання дынамічнай нераўнавагі (верагоднай сацыяльнай напругі), і гэта будзе выяўляцца паралельна з інфляцыяй і паглыбленнем працэсаў прыватызацыі. Памянёны фактар, аднак, не будзе мець істотнага значэння падчас сёлетняй выбарчай кампаніі.

Частка афіцыйнай эліты (перадусім беларускі ўрад) усведамляе новыя пагрозы для беларускай эканомікі і сацыяльнай стабільнасці ў краіне. Асноўнымі ж крыніцамі гэтых пагроз ёсць інфляцыя і нерэфармаванасць беларускай эканомікі.

З вялікай доляй верагоднасці можна сцвярджаць, што названыя вышэй працэсы будуць уплываць на ход выбарчай кампаніі і асвятленне яе ў медыях.